ские проблемы ментальности / менталитета. Сборник научных статей XII Международной научно-практической конференции/ под ред. К.Е. Кузьминой, И.В. Морозиковой; Н.П. Сенченкова. Смоленск: СмолГУ, 2016. С. 181–184.

7. Мостовая И. В., Скорик А.П. Архитипы и ориентиры российской ментальности // Полис, № 1, 1996. С. 6-12.

8. Налчаджян А.А. Этническая характерология. – Ереван, 2001.

9. Семенов В.Е. Православие как имманентная национальнаz идея России // Современные проблемы российской ментальности. Материалы Всероссийской научно-практической конференции / Отв. ред. Е.В. Семенов. – СПб.: Астерион, 2005. – С.137-140.

10. Сонин В.А. Психолого-педагогические проблемы профессионального менталитета учителя. – Смоленск: СГПУ, 1997.

11. Указ Президента РФ о традиционных ценностях https://57.mchs.gov.ru/deyatelnost/press-entr/novosti/4880370#:~:text=% (дата обращения: 2.12.22)



**Самуйлік Ярослаў Рыгоравіч (Yaraslau Samuilik)**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай і рускай моў Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта (г. Брэст, Рэспубліка Беларусь) (Brest, the Republic of Belarus); yaroslav551@rambler.ru

УДК 008:271.2(476.7)

# СВЯТЫ ЗАСТУПНІК ЗЯМЛІ БЕРАСЦЕЙСКАЙ АФАНАСІЙ ФІЛІПОВІЧ

***Анатацыя.*** У артыкуле разглядаюцца жыццё і дзейнасць прападобнамучаніка Афанасія Філіповіча (Берасцейскага) і яго роля ў адраджэнні Праваслаўнай Царквы на Беларусі.

***Ключавыя словы:*** святар, прападобны, Праваслаўная Царква, ігумен, манастыр, праваслаўнае брацтва, унія, сейм, дыярыуш.

# SAINT ATHANASIUS OF BREST-LITOŬSK, THE PATRON SAINT OF THE BREST LAND

***Annotation.*** The article examines the life and activities of the hieromartyr Athanasius of Brest-Litoŭsk (Afanasij Filipovič) and his role in the revival of the Orthodox Church in Belarus.

***Keywords:*** priest, hieromartyr, Orthodox Church, hegumen, monastery, Orthodox brotherhood, Union, Sejm, diary.

Афанасій Берасцейскі (Філіповіч; каля 1595 г. або 1597 г. – 1648 г.) – святар Кіеўскай метраполіі, святы шэрагу Праваслаўных Цэркваў, публіцыст, пісьменнік-палеміст, кампазітар, вядомы грамадска-рэлігійны дзеяч, зацяты праціўнік рашэнняў Брэсцкага царкоўнага сабора 1596 г.

Афанасій Філіповіч аўтар "Дыярыуша" («Діаріушъ албо список дейвъ правдивыхъ»), які змяшчае ўсю яго публіцыстыку і напеў гімнападобнага канта. Дыярыуш (ад лац. *diarium* 'дзённік') – жанр старажытнабеларускай літаратуры, у якім у храналагічнай паслядоўнасці перадаваліся падзеі грамадска-палітычнага ці прыватнага жыцця праз суб'ектыўнае ўспрыманне пэўнай асобы. Святар разглядаецца як адзін з апошніх прадстаўнікоў праваслаўнага (Кіеўская метраполія Канстанцінопальскага патрыярхату) напрамку ў палемічнай літаратуры XVII ст. і "апошні беларускамоўны пісьменнік" таго часу.

Дакладныя біяграфічныя звесткі пра жыццё Філіповіча да 1627 г. адсутнічаюць. Так, год яго нараджэння вагаецца недзе паміж 1595–1600 гг. У сваю чаргу, даследчыкі М. Пятроў і М. Жук у сваім артыкуле прыводзяць у якасці даты нараджэння прападобнага 1597 г., грунтуючыся, у прыватнасці, на паведамленні з "Дыярыуша" аўтара пра пострыг яго ў манахі ў 1627 г. Апошняе ў XVII ст. па статутным правіле ў Праваслаўнай Царкве дазвалялася толькі пры дасягненні трыццаці гадоў. У якасці дадатковага доказу аўтары артыкула ўказваюць на тое, што службу пры двары шляхты ў той час мог несці толькі чалавек старэйшы за дваццаць гадоў. Згодна з тым жа "Дыярыушам", да 1620 г. Афанасій ужо меў такую пасаду.

Невядома таксама і дакладнае месца нараджэння Філіповіча. Так, адны даследчыкі мяркуюць, што ён нарадзіўся на Берасцейшчыне, іншыя – на Гарадзеншчыне. Зрэшты тое, што святар быў ігуменам Свята-Сімяонаўскага манастыра ў Берасці, сведчыць пра яго паходжанне з Берасцейшчыны, таму што па царкоўных правілах XVII ст. такі вялікі пост у праваслаўнай іерархіі мог займаць, за рэдкім выключэннем, толькі чалавек, які нарадзіўся на гэтай зямлі. Такое меркаванне пацвярджаюцы радкі з эпітафіі на яго смерць: «забитый // В Берестю Литовском, на своей отчизни». Не існуе таксама звестак і пра свецкае імя Афанасія, як і пра тое, чым з'яўляецца імя "Філіповіч" – імем па бацьку ці прозвішчам.

А. Мельнікаў лічыць апошняе больш верагодным, бо манаскае імя Афанасій несумяшчальнае з імем па бацьку, у той час як прападобны нярэдка называе сябе «смиренным Афанасием Филипповичем». Падобнае спалучэнне духоўнага імя з фамільным было ў звычаі ў той час. Паводле М. Пятрова і М. Жука, у такіх

крыніцах, як «Исторические документы Минской губернии и Литовской православной епархии», даволі шмат асоб, якія адносяцца да дваранства і духавенства, носяць прозвішча «Филиппович».

Да таго ж існуе дзве гіпотэзы пра сацыяльнае паходжанне Філіповіча. Так, М. Кастамараў лічыў, што святар паходзіў з сям'і беднага шляхціца, таму што служыў пры двары гетмана Льва Сапегі хатнім настаўнікам. На яго погляд, такую магчымасць мелі толькі выхадцы са шляхты. Гэтай жа думкі прытрымліваюцца А. Мельнікаў, А. Цітавец, М. Пятроў і М. Жук, а таксама К. Тарасаў. Апошні лічыў, што чалавека без шляхецкага тытулу не запрасілі б у хатнія настаўнікі да "царэвіча". З другога боку, сам Афанасій у сваім "Дыярыушы" падкрэслівае, што ён «нендзный человек, простак, гарбарчик». Зыходзячы з гэтага, беларускі літаратуразнаўца А. Коршунаў лічыць, што прападобны паходзіў з сям'і гарадскога рамесніка-гарбара (такую ж магчымасць дапускае і А. Мельнікаў). Аднак гэтыя словы маглі быць сказаныя і ў адпаведнасці з перакананнямі манаха, які, жадаючы паказаць веліч Бога і Праваслаўнай Царквы і праявіць свае падданніцкія настроі і павагу да караля, павінен быў падкрэсліваць сваю "нэндзнасць" («нищету», «нужду»).

У дзяцінстве Філіповіч атрымаў даволі грунтоўную адукацыю, верагодна, у віленскай брацкай школе пры Свята-Духавым манастыры. Магчыма, пасля яе заканчэння, жадаючы прадоўжыць адукацыю, ён вучыўся ў Віленскім езуіцкім калегіуме. Афанасій добра ведаў багаслоўскую і гістарычную літаратуру, бліскуча валодаў польскай, лацінскай, грэчаскай, царкоўнаславянскай, старабеларускай мовамі. З маладых гадоў святар пачаў настаўнічаць «по науках церковно-русских», магчыма, у дамах праваслаўнай і каталіцкай шляхты.

З 1620 г. (паводле іншых пісьмовых крыніц – з 1622 г.) па 1627 гг. Філіповіч служыў пры двары канцлера Вялікага Княства Літоўскага Льва Сапегі, які запрасіў яго ў якасці "інспектара" (хатняга настаўніка) Яна Фаўсціна Лубы. Апошні быў прадстаўлены як "Дзмітравіч", рускі царэвіч Іаан, які нібыта з'яўляўся пляменнікам памерлага ў 1598 г. рускага цара Фёдара Іаанавіча і адначасова ўнукам Івана IV Грознага ад яго малодшага сына Дзмітрыя і Марыны Мнішак. Гэты "Дзмітравіч" сам з'яўляўся сынам аднаго з самазванцаў Ілжэдзмітрыя II, які дзейнічаў у 1607–1610 гг. На самай справе, Ян Фаўсцін быў сынам Дзімітрыя-Міхаіла Лубы, шляхціца з Падляшша, забітага ў Маскве пры мяцяжы супраць апалчэння Ілжэдзмітрыя I (часам указваецца Ілжэдзмітрый II), і жанчыны Марыі (ці Марыны), якая памерла ў зняволенні. Па іншай версіі Дзмітрый Луба быў забіты падчас Маскоўскага паходу, знаходзячыся ў складзе войскаў кароннага гетмана Жалкеўскага. Напачатку Афанасій быў упэўнены, што выхоўвае наследніка маскоўскага трона, і сваё запрашэнне да двара Сапегі разглядаў як акт перамогі Праваслаўнай Царквы. Праз пэўны час прападобны на падставе шэрагу фактаў здагадаўся пра паходжанне "царэвіча" і балюча перажываў свой нявольны грэх.

Неўзабаве Філіповіч, «зрозумевши омыльность света того», пакінуў службу пры двары канцлера і ў 1627 г. ад'ехаў ў Віленскі Свята-Духаў манастыр, дзе прыняў манаскі подстрыг ад ігумена Іосіфа (Бабрыковіча). Па блаславенні ігумена Іосіфа ён адправіўся на паслушэнства спачатку ў Куцеінскі манастыр пад Оршай, а потым – у Межыгорскі манастыр каля Кіева. Менавіта ўпамінанне ў

“Дыярыушы” межыгорскага ігумена Каментарыя і святара Самуіла Барэцкага, брата Кіеўскага мітрапаліта Іова Барэцкага, дапамагло дакладна датаваць знаходжанне прападобнага ў дадзеным манастыры 1627-м годам. З Межыгор’я Афанасій у 1632 г. (паводле іншых звестак – у тым жа 1627 г.) вярнуўся ў Вільню, дзе быў узведзены ў сан іераманаха.

У 1633 г. Філіповіч прыехаў у Дубойскі манастыр пад Пінскам, дзе стаў намеснікам ігумена Лявонція Шыціка. На працягу трох гадоў святар вёў упартую барацьбу за манастыр, аднак у 1636 г. намаганнямі Альбрэхта Станіслава Радзівіла, заўзятага прыхільніка каталіцтва, праваслаўныя былі сілай выгнаны з манастыра, а сама абіцель з усімі яе пабудовамі і землямі была перададзена езуітам. Факт гвалтоўнага адабрання манастыра аказаў моцнае ўражанне на Афанасія. У сувязі з гэтым ён пісаў, «як в захвиценю яком будучи», бачыў на небе таямнічыя з’явы – «седм огнов пекелных», а ў пятым агні – «жаристом гневи» – трох асоб: папскага легата, караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта Вазу і канцлера Льва Сапегу. Прападобны, спрабуючы ўтрымаць манастыр, склаў скаргу каралю польскаму і вялікаму князю літоўскаму Уладзіславу IV, дзе апісаў тое, што здарылася. Аднак нават пасля таго, як дакумент падпісалі многія праваслаўныя вернікі, станоўчых зрухаў не адбылося.

Затым Філіповіч пераязджае ў суседні Купяціцкі манастыр на Піншчыне да ігумена Іларыёна Дзянісавіча. Тут ён знаходзіць сябра ў асобе манаха Макарыя Такарэўскага. Апошні ў 1637 г. прывозіць ад мітрапаліта Пятра (Магілы) універсал з дазволам на збор ялмужны – ахвяраванняў на аднаўленне Купяціцкай царквы. У лістападзе 1637 г. па блаславенні ігумена і парадзе брацii Афанасій адправіўся на збор гэтых ахвяраванняў разам са сваім паслушнікам Анісімам Валкавіцкім. Увечары, за дзень да ад’езду, прападобны ў сваёй келлі пачуў словы: «Царь Московский построет мне церковь! Иди до него!». Перад паездкай падчас малення ў царкоўным прытворы святар убачыў у акенцы абраз Божай Маці і пачуў голас, які сказаў, што ён ідзе з ім. Афанасій пабачыў таксама і вобраз памерлага перад гэтым дыякана Неяміі.

Пад выглядам збору міласціны Філіповіч праз Слуцк і Оршу накіраваўся ў Маскву шукаць абароны праваслаўнай веры ў расійскага цара Міхаіла Фёдаравіча. Прыбыўшы ў Слуцк, Афанасій сустрэўся з нечаканымі цяжкасцямі: архімандрыт Самуіл Шыцік пазбавіў яго ўніверсала на той падставе, што святар не меў права збіраць міласціню на тэрыторыі, якая не адносіцца да Луцкай епархіі. Калі ж у канцы студзеня 1638 г. канфлікт быў вырашаны, Афанасій са сваім спадарожнікам накіраваўся ў Куцейна прасіць ігумена Іаіля Труцэвіча, звязанага з найбольш вядомымі прадстаўнікамі расійскага духавенства, пасадзейнічаць у пераходзе мяжы ў Масковію (на мяжы быў узмоцнены нагляд з-за таго, што казакі, асцерагаючыся расправы пасля нядаўняга бунту, уцякалі з Рэчы Паспалітай у Расію).

Узяўшы ў ігумена Іаіля рэкамэндацыйныя лісты «карточек сведных о себе», – Філіповіч накіраваўся ў Копысь, Магілёў, Шклоў і зноў вярнуўся ў Куцеінскі манастыр, дзе намеснік Іосіф Сурта рэкамэндаваў пайсці ў Маскоўскае царства праз Трубчэўск. Збіўшыся з дарогі і ледзь не патануўшы у Дняпры, абрабаваныя і збітыя на адным з заезных двароў, вандроўнікі дабраліся, нарэшце, да Трубчэўска. Аднак і тут іх чакала няўдача: князь Трубяцкі катэгарычна адмовіўся выдаць ім пропуск, падазраючы ў іх шпіёнаў.

Вымушаны вярнуцца, Афанасій наведаў па дарозе Чоўскі манастыр, дзе адзін са старцаў параіў яму зрабіў спробу перайсці мяжу ў раёне Ноўгарад-Северскага пры садзейнічанні тамашняга ваяводы Пятра Песячынскага. Паломнік з падзякай прыняў добрую параду і перасек мяжу ў вёсцы Шэпелява. Неўзабаве на шляху ў Маскву Філіповіч пасварыўся са сваім паслушнікам, які перастаў верыць у поспех іх місіі.

Па прыбыцці ў Маскву вандроўнікі спыніліся ў Замаскварэччы, на Вялікай Ардынцы. Паколькі трапіць на прыём да цара, не маючы паўнамоцтваў і дакументаў пра сябе, было цяжка, то тут, у Маскве, у першым сваім публіцыстычным творы, спецыяльнай рэляцыі "Гісторыя падарожжа ў Маскву", складзенай у сакавіку 1638 г., Афанасій апісаў цару мэты і гісторыю свайго нялёгкага падарожжа (апошнюю выклаў у выглядзе дзённіка). У рэляцыі, напісанай у своеасаблівай форме, з выкарыстаннем арыгінальных паэтычных прыёмаў, было паказана нялёгкае становішча ў Рэчы Паспалітай праваслаўных вернікаў Беларусі і Украіны і маліў заступіцца за апошніх. Філіповіч хацеў пераканаць Міхаіла Фёдаравіча пачаць вайну з Рэччу Паспалітай для абароны праваслаўнай веры, спасылаючыся на Багародзіцу, якая нібыта сказала яму: «О Афанасий! Иди до царя Михаила и рци ему: звитяжай неприятели наши, бо юж час пришол». Акрамя таго, святар раіў расійскаму кіраўніку зрабіць на харугвах выяву Купяціцкай Божай Маці, якая разам з запіскай была перададзена цару. Таксама ён паведаміў Міхаілу Фёдаравічу пра падрыхтоўку Ілжэдзмітрыя. Прыняты ў Пасольскай хаце, Філіповіч, сярод іншага, паведамляе пра падрыхтоўку самазванца. У кветаносную, Вербную нядзелю Афанасій, сабраўшы шчодрыя ахвяраванні, пакінуў Маскву і 16 (26) чэрвеня 1638 г. прыбыў ў Вільню, а ў ліпені вярнуўся у родны (Купяціцкі) манастыр.

У 1640 г. ў Купяціцы паступіла прашэнне ад брацііі Свята-Сімяонаўскага манастыра ў Берасці, якая страціла настаяцеля, блаславіць да іх ігуменам або Афанасія Філіповіча, або Макарыя Такарэўскага. У выніку на дадзеную пасаду быў абраны Афанасій. Тут ён апынуўся ў самым цэнтры барацьбы Праваслаўя з уніяй, бо Берасце быў горадам, у якім з'явілася на свет і як нідзе больш распаўсюдзілася "грэка-каталіцтва". Яшчэ раней усе 10 праваслаўных храмаў горада былі пераўтвораны ва ўніяцкія, і толькі ў 1632 г. праваслаўнаму брацтву ўдалося вярнуць храм у імя Сімяона Стоўпніка з манастыром пры ім, а ў 1633 г. – царкву ў гонар Нараджэння Багародзіцы.

У мэтах абароны праваслаўных храмаў ад замахаў уніятаў Афанасіем былі знойдзены і занесены ў гарадскія кнігі магдэбургіі шэсць дакументаў XV ст., якія адносіліся да берасцейскага Мікалаеўскага брацтва, што аб'ядноўвала манастыры Нараджэння Багародзіцы і Сімяона Стоўпніка. Знойдзеныя ігуменам паперы давалі падставы да юрыдычнага афармлення правоў брацтва Нараджэння Багародзіцы. Таму ў верасні 1641 г. святар прыязджае на Варшаўскі вальны сейм, дзе 13 кастрычніка яму ўдалося атрымаць у каралеўскай канцылярыі прывілей, які пацвярджаў ранейшыя граматы і правы братчыкаў і даваў дазвол на набыццё зямлі ў Берасці для пабудовы брацкага дома. Аднак канцлер Альбрэхт Радзівіл і падканцлер Трызна адмовіліся ратыфікаваць дакумент "нават за трыццаць цвёрдых талераў", спасылаючыся на забарону папы рымскага распаўсюджваць далей праваслаўную веру. З асцярогі новых праследаў праваслаўныя епіскапы, якія сабраліся на сейм, не змаглі дапамагчы Філіповічу.

У 1643 г. Афанасій зноў прыбывае ў Варшаву на чарговы вальны сейм. Адначасова з дыяканам Лявонціем Божжам, які прыехаў разам з ім, ён 10 сакавіка 1643 г. увайшоў у сенат і пасольскі двор. Перапыніўшы судовую справу, на якой прысутнічаў польскі кароль Уладзіслаў IV, святар раздае каралю і сенатарам спісы на палатне Купяціцкай іконы Божай Маці з надпісам-перасцярогай, якая сведчыць пра прыгнёт праваслаўных у Рэчы Паспалітай (тое ж зрабіў дыякан Божжа на пасольскім двары). Прападобны патрабаваў у караля «абы вера правдивая грецкая грунтовне была успокоена, а унея проклятая вынещена и внивеч обернена», пагражаючы ў адваротным выпадку Божым Судом. На другі дзень кароль загадаў выдаць праваслаўным прывілей.

За гэты ўчынак вышэйшыя царкоўныя ўлады абвясцілі Афанасія вар'ятам і запатрабавалі з'явіцца на суд, дзе абвінавацілі яго ў тым, што ён самавольна, без іх парады і дазволу рызыкнуў з'явіцца на сейм і высоўваць ультыматыўныя ўмовы ад імя ўсёй Праваслаўнай Царквы. Пазней сам Філіповіч адзначаў: «Юж-юж и сами отцеве наши старшии в вере православной о помноженю хвалы бозское не дбают». Прысутныя на сейме праваслаўныя іерархі і ігумены буйных манастыроў баяліся наступстваў рэзкіх выказванняў і неардынарных паводзін святара. Таму, паводле іх распараджэння, прападобны быў пасаджаны пад варту разам са сваім паплечнікам дыяканам Лявонціем у доме каралеўскага брамніка Яна Жалязоўскага на некалькі тыдняў – аж да заканчэння сейма. У адказ на гэта 25 (4 красавіка) сакавіка 1643 г., на святкаванне Дабравешчання Прасвятой Багародзіцы, Афанасій збег са зняволення ў адных клабуку і парамандзе. Выдаючы сябе за юродзівага_і выкачаўшыся ў гразі, ён, б'ючы сябе посахам, у такім выглядзе бегаў па ўсёй Варшаве з крыкамі: «Беда проклятым і неверным! Vae maledictus et infidelibus!».

Неўзабаве Афанасій ізноў быў узяты пад варту, а пасля раз'езду сейма – аддаены царкоўнаму суду. Было прынята рашэнне часова пазбавіць яго іерэйскага і ігуменскага сану («сужоный, декретованый, з презвитерства и игуменства деградованый»). Філіповіч быў адпраўлены ў Кіеў на канчатковае разбіральніцтва кансісторыі. Падчас зняволення, у чаканні прыезду ўрадавага абвінаваўцы, ён напісаў на латыні "Тлумачальную запіску суду духоўнай кансісторыі". Суд пад старшынствам рэктара Кіева-Магілянскай акадэміі Інакенція Гізеля пастанавіў, што Афанасій выкупіў свой "грэх" зняволеннем і што, такім чынам, яму павінна быць даравана свабода і вернуты сан святара. Мітрапаліт Пётр Магіла пацвердзіў гэта рашэнне і 20 чэрвеня накіраваў прападобнага ігуменам ў Свята-Сімяонаўскі манастыр з пасланнем, у якім прадпісвалася быць больш асцярожным і стрыманым у царкоўных справах.

Па вяртанні ў манастыр Афанасій пражыў "у супакоі нейкі час". Аднак супакой гэты быў вельмі адносным, таму што не спыняліся бесперапынныя напады на манастыр езуіцкіх студэнтаў і ўніяцкіх святароў, якія абражалі і нават часам збівалі праваслаўных манахаў.

Спадзяючыся атрымаць падрымку ў наваградскага ваяводы Мікалая Крыштафа Сапегі, які лічыўся патронам Сімяонаўскага манастыра, і ў

спадзяванні на тое, што ён дапаможа выклапатаць ахоўную грамату для праваслаўных берасцейцаў, Філіповіч у 1644 г. адправіўся у Кракаў, збіраючы па шляху ахвяраванні для сваёй абіцелі. Аднак падтрымкі ў ваяводы знайсці не ўдалося, і прападобны накіраваўся да маскоўскага пасла князя Львова, які жыў у той час у Кракаве і займаўся расследаваннем спраў аб самазванцах. Сустрэўшыся з ім, Афанасій расказаў пра сваё падарожжа ў Маскву, а таксама паведаміў мноства фактаў пра Яна Фаўсціна Лубу, прад'явіўшы адно з яго апошніх пасланняў, пэўныя фрагменты якога давалі падставы ўзбудзіць супраць самазванца судовае расследаванне.

Афанасій быў выкліканы з Кракава ў Варшаву лістом варшаўскага юрыста Зычэўскага, які паведамляў яму 3 мая 1644 г., што яго намаганнямі грамата, дадзеная Філіповічам для завярэння ў канцлера, забяспечана ўсімі неабходнымі пячаткамі. Юрыст патрабаваў выкупіць прывілей за шэсць тысяч злотых, аднак, прыехаўшы ў Варшаву, святар выявіў, што яго прывілей не занесены ў каралеўскую метрыку і не мае законнай сілы. Па гэтай прычыне ігумен адмовіўся выкупляць фіктыўны дакумент.

Вярнуўшыся ў Берасце з Варшавы, Афанасій замовіў у мясцовым бернардынскім манастыры копію Купяціцкай іконы Божай Маці і змясціў яе ў сваёй келлі. Натхнёны іконай, Філіповіч прыступіў да складання новай публічнай скаргі, з якой разлічваў выступіць на сейме 1645 г. Для гэтага ж ён падрыхтаваў некалькі дзясяткаў копій рукапіснай "Гісторыі падарожжа ў Маскву" з выявай Купяціцкай іконы Божай Маці.

Аднак за некалькі тыдняў да сейма летам 1645 г. у Берасці Афанасій быў арыштаваны як "дзяржаўны злачынца" і адпраўлены пад канвоем у Варшаву ў якасці закладніка за забранага ў Маскву Я.Ф. Лубу. Пра штодзённыя допыты і катаванні святара сведчыць ліст нейкага Міхаіла. Просьбы аб вызваленні не мелі выніку, нягледзячы на тое, што прашэннямі пасла Гаўрылы Сцямпкоўскага 23 ліпеня Я.Ф. Луба быў адпушчаны.

Знаходзячыся ў зняволенні каля паўгода, Афанасій напісаў шэраг артыкулаў: "Навіны" (з уласным духоўным вершам, пакладзеным на ўласную музыку), "Фундамент непарадку касцёла рымскага", "Падрыхтоўка да суда", "Парада пабожная", "Пра фундамент царкоўны", "Супліка трэцяя" (была пададзена прыхільнікам святара ў карэту караля пры яго выездзе), у якіх ён выклаў свае погляды на гісторыю Берасцейскай уніі і паказаў яе згубнасць для Праваслаўя і самой дзяржавы Рэчы Паспалітай. Тады ж Філіповічам была складзена "Праўда", адрасаваная каралю Уладзіславу IV і пададзеная яму 29 чэрвеня 1645 г., дзе ён прапанаваў канкрэтныя шляхі "прымірэння Цэркваў" і дасягнення добрага ладу ў дзяржаве. У першую чаргу Афанасій раіў пазбавіцца ад уплыву езуітаў, звярнуцца праз лісты да пяці патрыярхаў Усходняй Царквы і на Саборы вярнуць законныя правы святога Праваслаўя ў Вялікім Княстве Літоўскім.

У творах, напісаных прападобным падчас знаходжання ў варшаўскай турме і адрасаваных каралю, зноў жа ўтрымліваецца крытыка тагачасных царкоўных іерархаў і свецкіх магнатаў, а таксама прапановы адраджэння Праваслаўнай

Царквы і заключэння саюза з Расіяй. Пры гэтым свой арышт Філіповіч лічыў палітычнай акцыяй і помстай за яго барацьбу ў абарону Праваслаўя.

Не паддаўшыся на правакацыі з уцёкамі з турмы, Афанасій чакаў свайго вызвалення, асабліва пасля распаўсюджвання чутак аб тым, што кароль хоча з ім асабіста сустрэцца. Чуткі, аднак, не спраўдзіліся, але ўжо 3 лістапада (13 лістапада) 1645 г. згодна з загадам каралеўскага ўніверсала Філіповіч у суправаджэнні канвою быў адпраўлены ў Кіеў пад нагляд мітрапаліта Кіеўскага Пятра (Магілы). Апошні пакінуў святара ў Кіева-Пячэрскай лаўры. Менавіта тут у 1646 г. Афанасіем быў створаны “Дыярыуш” у тым выглядзе, у якім быў пасля апублікаваны (акрамя апошняй часткі): усе свае артыкулы аўтар звёў у адну працу, забяспечыўшы раннія творы каментарыямі. Затым Філіповіч перадаў “Дыярыуш” Пятру (Магіле) з надзеяй на вызваленне, але апошняя не апраўдалася.

У сярэдзіне верасня 1646 г. у Пячэрскай манастырскай царкве Афанасій выступіў у вобразе юродзівага, каб нагадаць аб сваёй невінаватасці. Тлумачэнне гэтым дзеяннем ён выклаў у сваім апошнім артыкуле – «Причины поступку моего таковые в церкви святой Пячаро-Киевской чудотворной на Воздвижение Честного Креста року 1646».

Пасля смерці мітрапаліта Пятра (Магілы) 1 студзеня 1647 г. Луцкі іерарх Афанасій Пузына, які прыехаў на яго пахаванне, забраў пры ад’ездзе з сабой Філіповіча і пасля просьбаў брацыі дазволіў яму вярнуцца у Берасце. У сувязі з паўстаннем Багдана Хмяльніцкага ў 1648 г. супраць праваслаўных вернікаў узнялася новая хваля ганенняў. Па даносе капітана каралеўскай гвардыі Шумскага суботнім днём 1 ліпеня (10 ліпеня) 1648 г. прападобны быў арыштаваны адразу пасля Боскай літургіі ў храме Нараджэння Багародзіцы па абвінавачанні ў супрацоўніцтве з Б. Хмяльніцкім, нібыта за «посылане якихсь листов и пороху до козаков». У адказ на абвінавачванні Афанасій запатрабаваў сведчанняў мытнікаў: «Нехай они признают, если я коли колвек куды порохи проводил. А стороны листов, нехай ми тут довод який на тое покажет, абым их посылал, яко поведает». Неўзабаве ў берасцейскім манастыры быў праведзены вобыск, які, аднак, не даў станоўчых вынікаў.

Тады ў віну Філіповічу паставілі тое, што «унею святую ганил и проклинал». У адказ на апошняе абвінавачванне Афанасій адказваў: «Проклятая есть теперешняя уния ваша. И ведайте о том запевне, если еи з панства своего не выкорените, а православной церкви всходней не успокоите, гневу божого над собой заживете». Суддзі пастанавілі, што Філіповіч заслугоўвае смяротнага пакарання, аднак для апошняга патрабавалася канчатковая санкцыя з Варшавы. Афанасія часова закавалі ў калодкі і кінулі ў цэйхгаўз. У ноч на 5 верасня, неўзабаве пасля таго, як святар пацвердзіў праклён уніі перад прыехаўшымі луцкім біскупам Гембіцкім і канцлерам Альбрэхтам Радзівілам, у яго келлю быў накіраваны студэнт-езуіт. Аднак спробы апошняга схіліць Філіповіча на свой бок былі няўдалымі. Неўзабаве Афанасія, папярэдне зняўшы з яго калодкі, прывялі да берасцейскага ваяводы А. Масальскага, які, не жадаючы браць яго да сябе,

сказаў: «По що-сте его до мене привели? Маете юж в руках своих, чините ж собе з ним що хощете». Затым Філіповіча з абозу ваяводы вывелі ў бор каля вёскі Гершановічы (пазней – вёска Гершоны; з 1 чэрвеня 2007 г. – у межах горада Берасця) і пасля катаванняў («там его напрод пекли огнем. И казали – мушкет набили двома кулями… И дол казали наготовили») салдаты берасцейскага ваяводы забілі святара. Паводле сведчанняў відавочцаў, паранены дзвюма кулямі ў лоб навылёт, ён нейкі час стаяў, прыхіліўшыся да хвоі, пакуль не быў сапхнуты ў выкапаную магілу. Перад смерцю прападобны не адмовіўся ад сваіх слоў: «Што юж рекл, том рекл, и з тым умираю».

Толькі праз восем месяцаў, першага мая 1649 г., нейкі хлопчык паказаў манахам, дзе была магіла ігумена. Сёмага мая 1649 г. з дазволу палкоўніка Феліцыяна Тышкевіча манахі выкапалі цела і перанеслі яго рэшткі ў свой манастыр і з ушанаваннямі пахавалі ў склепе на правым клірасе ў храме святога Сімяона Стоўпніка.

Усё сваё свядомае жыццё Афанасій Філіповіч змагаўся з уніяй, за аб’яднанне праваслаўных народаў. Так, будучы заўзятым праціўнікам рашэнняў Берасцейскага сабора 1596 г., прападобны лічыў, што абвастрэнне сацыяльных і рэлігійных супярэчнасцей у дзяржаве стала непасрэднай праявай наступстваў уніі, якая закранула як свецкае, так і духоўнае жыццё Рэчы Паспалітай, прывяла да парушэння агульнапрынятых законаў і зневажання правоў народа.

З’яўляючыся, такім чынам, галоўнай прычынай рознагалоссяў у грамадстве і, на думку Філіповіча, навязанай народу (а значыць і незаконнай), унія павінна быць знішчана. Аднак у творах святара не ўтрымліваецца закліку да гвалту: аўтар, будучы добра падрыхтаваны юрыдычна, імкнецца дзейнічаць у рамках прававой сістэмы Рэчы Паспалітай. Так, добра ведаючы гісторыю Праваслаўнай Царквы разам з прававой базай, якая рэгулюе яе дзейнасць у дзяржаве, ён аргументавана выбудоўвае свае абвінавачанні. Акрамя таго, разглядаючы унію і яе перадгісторыю, Афанасій прыцягвае і цытаты з гістарычных хронік. На думку мысляра, неабходнымі ўмовамі вяртання міру ў грамадства Рэчы Паспалітай з’яўляюцца справядлівасць і недатыкальнасць законных духоўных інтарэсаў праваслаўных вернікаў. Усёй паўнатой заканадаўчай улады павінен валодаць не хто іншы, як кароль: менавіта апошні зможа вярнуць згоду ў грамадства. Астатнія ж органы ўлады – сенат, сінод і сейм – павінны валодаць толькі дарадчай функцыяй, інакш шляхецкая анархія ў дзяржаве працягнецца. Пры гэтым свецкая ўлада павінна прэтэндаваць толькі на зямны свет, у той час як духоўны застаецца ёй непадуладным, у тым ліку і папе рымскаму.

Ад іншых антыўніяцкіх пісьменнікаў-палемістаў Філіповіча адрознівала тое, што ў сваіх творах ён стараўся не закранаць царкоўна-дагматычнага багаслоўя. Дадзеная асаблівасць яго творчасці была заснавана на перакананні ў тым, што ў аснове імкнення і польскіх феадалаў, і Каталіцкай Царквы, якія заручыліся падтрымкай некаторых праваслаўных іерархаў, уніфікаваць абодва веравызнанні ляжалі палітычныя матывы, а зусім не рэлігійныя. Вынікам сталі не толькі крытыка Уніяцкай і Каталіцкай Цэркваў, але і выкрыванне кіруючых шляхецка-магнацкіх колаў Рэчы Паспалітай.

У сваю чаргу, у творах, напісаных Філіповічам у варшаўскай турме, адлюстравалася яго ўпартая барацьба за «грунтовное успокоение православного вероисповедания», за нармалізацыю адносін з Расіяй. Умацаванне апошніх ён абгрунтоўваў «волей Божией» і выступаў супраць вайны з гэтай дзяржавай.

Афанасій Філіповіч з’яўляецца аўтарам зборніка “Дыярыуш” («Діаріушъ албо список деѣвъ правдивыхъ») – аднаго з першых літаратурных твораў (паводле М. Дабрыніна – аўтабіяграфічная палемічная аповесць, паводле С. Гараніна – споведзь-пропаведзь) аўтабіяграфічнага жанру і адзінай палемічнай аўтабіяграфіі ў беларускай літаратуры. Святар лічыцца таксама адным з апошніх прадстаўнікоў праваслаўнага напрамку ў палемічнай літаратуры таго часу, артыкулы якога змяшчаюць цікавыя звесткі па сучаснай аўтару царкоўнай гісторыі беларускіх земляў. Прападобны ўсё сваё жыццё прысвяціў змаганню за правы і прывілеі Праваслаўнай Царквы, таму грамадскае і асабістае ў яго зборніку цесна пераплецена.

“Дыярыуш” складаецца з сямнаццаці інфармацыйных фрагментаў, два з якіх напісаны пасля смерці Філіповіча. Тэкст самога святара складаецца з дзесяці самастойных артыкулаў, напісаных у 1638–1646 гг. і аб’яднаных пяццю ўстаўкамі.

У “Дыярыушы” аб’яднаны ў адно цэлае дарожныя і тлумачальныя запіскі аўтара, яго успаміны, дзённікі і аўтабіяграфічны нарыс пра пражытае і перажытае, розныя легенды і ўбачаныя містычныя вобразы, пасланні і лісты Філіповіча, яго выкрывальніцкія прамовы, канспектыўныя накіды асобных артыкулаў, філасофска-багаслоўскія трактаты, вершы, прысвечаныя барацьбе, і нават напеў (запісаны кіеўскай 5-радковай натацыяй) гімнападобнага канта – аднаго з найбольш ранніх нотных запісаў у беларускай музыцы.

Да таго ж, акрамя вышэйзгаданых артыкулаў Філіповіча, у дадатку да “Дыярыуша” змешчаны творы, напісаныя пасля смерці прападобнага манахамі берасцейскага Свята-Сімяонаўскага манастыра: “Пра слаўную смерць… Афанасія Філіповіча” і “Надгробак Афанасію Філіповічу”.

“Дыярыуш” Філіповіча стракаты па стылю – апавядальная манера змяняецца заклікавай публіцыстычнасцю, дакументальныя згадкі – містычнымі карцінамі і г. д. Святар выступае то прапаведнікам “разумнай мернасці” ў грамадстве, то ваяўнічым абаронцам “веры праўдзівай і царквы ўсходняй грэчаскай”.

У “Дыярыушы” Філіповіча няма кніжнай рыторыкі, да чаго часта звяртаўся ў творах яго сучаснік Мялецій Сматрыцкі. Аўтар абапіраўся на ўласныя назіранні, на факты рэчаіснасці. Апантаны да фанатызму, надзвычай уражлівы, святар часам “бачыў” тое, што выходзіць за рамкі рэальнага. Так, у адной з частак “Дыярыуша” ён апісвае “борзо страшнии видоки на неби и земли”, убачанае ім не ў сне, а на яве і ў дзень. На небе – гнеўныя хмары з войскам, пастаўленым у строй, на зямлі – сем агнёў пякельных, прыгатаваных на сем смяртэльных грахоў. «З тых огнюв … трох особ выразне видилем: нунциуша легата в короне папежской. Жигмонта кроля и Сапегу гетмана, за преследоване церкви восточной барзо смутно седячих». Поруч з гэтым у творы шмат дакладных

апісанняў і згадак: «Мещане зась убогие з Люблина, Сокаля, Орши, Пинска, Белска, Кобриня, Берестя и з инших мест и местечек плачливе ляментуют, же юж не мают и людей, з ким бы церквей своих доходити могли!.. Ах, беда ж! Креста не принявши детки, а дарослые без шлюбов живут, а умерлых в полях, в огородах и в пивницах потаемне в ночи погребают!.. Над турецкую неволю, тут в панстве христианском православные люде болшую неволю терпят и мают! Бо оршане бедные за тое, што в братстве своем новую церков збудовали, двесте червоных золотых подканцлерому за печать давали…».

"Дыярыуш" Філіповіча напісаны ў пераходны і пераломны для рэлігійнай барацьбы час і знаходзіцца на памежжы палемічнай і мемуарнай літаратуры. Твор вызначаецца адкрытай тэндэнцыйнасцю, палітычнай і рэлігійнай завостранасцю, пафаснасцю, ідэйнай насычанасцю. У "Дыярыушы" спалучаюцца элементы барока, гатычнай паэтыкі і рэалізму. Да таго ж неаднародная мова і кампазіцыя твора – месцамі амаль размоўная, месцамі ўскладненая і заблытаная са шматлікімі паланізмамі і стараславянізмамі. Разам з тым мова твора – "сакавітая, прыгожая, мілагучная, мова беларуса, беларуса высокаадукаванага". Аўтар лічыў, што яго "Дыярыуш" захавае актуальнасць і пазней, «у потомные часы».

Зберагліся два спісы "Дыярыуша" – адзін у складзе Тлумачальнага Псалтыра, які належаў мітрапаліту Дзімітрыю Растоўскаму (захоўваецца ў Маскве ў Дзяржаўным гістарычным музеі), і менш поўны спіс позняга паходжання са збору Расійскай нацыянальнай бібліятэкі (Санкт-Пецярбург).

Афанасій Філіповіч быў прызнаны святым неўзабаве пасля сваёй смерці (паміж 1658 і 1666 гг.). Ужо 5 студзеня 1658 г. Кіева-Пячэрскі архімандрыт Інакенцій Гізель і Ляшчынскі ігумен Іосіф Нелюбовіч-Тукальскі паведамілі цару Аляксею Міхайлавічу, што над мошчамі прападобнага нібыта неаднаразова ззяла цудоўнае святло.

Неўзабаве ў народзе было складзена паданне пра гібель Філіповіча і царкоўны спеў у яго гонар. Існуе таксама напісаны 30 жніўня 1819 г. архімандрытам Маркіянам кандак і трапар. Калі было устаноўлена афіцыйнае святкаванне – невядома, аднак Афанасій Берасцейскі называецца прападобным мучанікам, прылічаным да ліку кіеўскіх святых, яшчэ ў "Гісторыі пра унію" свяціцеля Георгія Каніскага.

Дваццатага ліпеня 1666 г. мошчы прападобнамучаніка Афанасія былі адкрыты. З гэтай нагоды ў Берасці было складзена "Жыціе" святога на польскай мове, у якім ігумен Афанасій называецца "святым і прападобнамучанікам". У 1805 г. у Кіеўскай духоўнай акадэміі "Жыціе" было перакладзена на рускую мову. Захаваўся таксама дакумент, які распавядае пра смерць прападобнамучаніка: «О смерти славной памяти небожчика отца Афанасіа Филиповича, ігумена берестейского православного, повесть през послушников его списана, року 1648 сталой, под час бескрулевья».

Напачатку верасня 1815 г. у выніку пажару ў Сімяонаўскай царкве медная рака з мошчамі святога Афанасія расплавілася. Пасля выяўлення на наступны

дзень часцінак мошчаў прападобнамучаніка святар Самуіл Лісоўскі паклаў іх на алавяны сподак пад алтаром манастырскай трапезнай царквы. У 1823 г., калі адбылося прынящце царкоўнай маёмасці новым настаяцелем Аўтаномам, іх сапраўднасць засведчылі прысяжнымі паказаннямі сем жыхароў Берасця: яны ўваходзілі ў лік тых, хто ўдзельнічаў пасля пажару ў збіранні часцінак мошчаў. Неўзабаве па просьбе Аўтанома ад Мінскага архіепіскапа Анатолія паступіла распараджэнне: «положить мощи в ковчег и хранить оные в церкви с благоприличием».

У лістападзе 1856 г. каля каўчэга з мошчамі прападобнага Афанасія, дзякуючы дзеянню малітваў да святого, вылечыўся дзесяцігадовы сын памешчыка Паліванава, які быў вымушаны спыніцца ў Берасці з прычыны хваробы дзіцяці. У 1857 г. у падзяку за вылячэнне сына памешчык ахвяраваў для мошчаў каштоўны сярэбраны пазалочаны каўчэг (у 1894 г. над ім былі створаны шаты з выявай святога). Пасля закрыцця манастыра каўчэг быў перавезены ў Антырэлігійны музей мастацтваў, размешчаны ў Данскім манастыры, а адтуль у 1935 г. паступіў у Дзяржаўны гістарычны музей Расіі. Да 14 мая 1860 г. адносіцца таксама факт вылячэння смяротна хворага протаіерэя Васіля Салаўевіча.

Напрыканцы верасня 1893 г. у Гарадзенскім Барысаглебскім манастыры быў узведзены храм у імя святога прападобнамучаніка Афанасія Берасцейскага (на жаль, да нашых дзён не захаваўся). На мяжы XIX–XX стст. у вёсцы Аркадзія пад Берасцем (з 1 чэрвеня 2007 г. у межах горада) у памяць аб Афанасіі Берасцейскім, недалёка ад месца яго гібелі, была ўзведзена драўляная капліца – Свята-Афанасьеўская царква са званіцай на галоўным фасадзе. Яна ўяўляе сабой помнік народнага драўлянага дойлідства з рысамі рэтраспектыўна-рускага стылю. У 1998 г. капліца была абноўлена сіламі прыхаджан. Тут жа ў 1996 г. па блаславенні Свяшчэннага Сінода Рускай Праваслаўнай Царквы быў заснаваны Свята-Афанасьеўскі манастыр, у склад якога ўваходзіць і вышэйназваная царква.

Восенню 1893 г. часцінка святых мошчаў Афанасія Берасцейскага была перанесена ў Ляснінскі жаночы манастыр у Польшчы. У канцы Другой сусветнай вайны манастыр (разам са святымі мошчамі) спачатку пераехаў ў Сербію, а потым у Францыю. У 1995 г. частка мошчаў была прывезена ў Беларусь і перададзена ў берасцейскія Свята-Сімяонаўскі сабор, Свята-Афанасьеўскую царкву і Свята-Мікалаеўскі храм.

З 1996 г. Афанасій Берасцейскі з'яўляецца святым апекуном Люблінскай і Холмскай епархіі Польскай Праваслаўнай Царквы.

У 2006 г. у Берасці на праспекце Машэрава каля Свята-Сімяонаўскага сабора быў узведзены помнік "нябеснаму заступніку" Афанасію Берасцейскаму (Філіповічу) працы скульптара Алесі Гуршчанкавай. У 2010 г. Сінод Беларускай Праваслаўнай Царквы заснаваў ордэн прападобнамучаніка Афанасія Берасцейскага.

Памяць святога Афанасія Берасцейскага Руская Праваслаўная Царква ўшаноўвае некалькі разоў на год: 5 (18 паводле новага стылю) верасня – у дзень смерці, 20 ліпеня (2 жніўня) – у дзень знаходжання мошчаў, а таксама ў дзень Сабора Беларускіх святых (3-я нядзеля па Пяцідзясятніцы).

Такім чынам, Афанасій Філіповіч (Берасцейскі) ахвяраваў сваім жыццём дзеля адраджэння, захавання і ўмацавання Праваслаўнай Веры на беларускіх і ўкраінскіх землях [1; 2, с. 450–451; 3–6; 7, с. 125; 8, с. 267; 9–14].

**Спіс выкарыстанай літаратуры:**


1. Аркадзія [Электронны рэсурс] // Вікіпедыя : свабод. энцыкл. – Рэжым доступу: https://be-tarask.wikipedia.org/wiki/Аркадзія. – Дата доступу: 10.11.2020.
2. Асветнікі зямлі беларускай, X – пачатак XX ст. : энцыкл. давед. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2001. – 492 с.
3. Афанасий Брестский [Электронный ресурс] // Википедия : свобод. энцикл. – Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki/Афанасий_Брестский. – Дата доступа: 10.02.2022.
4. Афанасій Брэсцкі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://smafc.org/wiki/Афанасий_(Филиппович). – Дата доступу: 15.02.2022.
5. Афанасій Філіповіч [Электронны рэсурс] // Вікіпедыя : свабод. энцыкл. – Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/Афанасій_Філіповіч. – Дата доступу: 04.11.2020.
6. Афанасі Філіповіч [Электронны рэсурс] // Вікіпедыя : свабод. энцыкл. – Рэжым доступу: https://be-tarask.wikipedia.org/wiki/Афанасі_Філіповіч. – Дата доступу: 12.02.2022.
7. Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1996–2004. – Т. 2 : Аршыца – Беларусцы. – 1996. – 480 с.
8. Вялікае Княства Літоўскае : ВКЛ : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2005–2006. – Т. 1. – 2005. – 687 с.
9. Гершоны (Брэст) [Электронны рэсурс] // Вікіпедыя : свабод. энцыкл. – Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/Гершоны_(Брэст). – Дата доступу: 10.11.2020.
10. Дыярыш Філіповіча [Электронны рэсурс] // Вікіпедыя : свабод. энцыкл. – Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/Дыярыуш_Філіповіча. – Дата доступу: 10.11.2020.
11. Звышгодны мучанік Апанас, ігумэн Берасьцейскі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://baocinfo.blogspot.com/2011/09/blog-post.html. – Дата доступу: 15.02.2022.
12. Кулажанка, Л. Святы прападобнамучанік Афанасій Брэсцкі [Электронны рэсурс] / Л. Кулажанка // Царкоўнае слова. – 2008. – 22 верас. – Рэжым доступу: https://www.blagobor.by/article/saint/afanasiy. – Дата доступу: 12.02.2022.
13. Луба, Ян Фаустин [Электронный ресурс] // Википедия : свобод. энцикл. – Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki/Луба,_Ян_Фаустин. – Дата доступа: 12.02.2022.
14. Преподобный Афанасий, игумен Брестский [Электронный ресурс] // Православный календарь. – Режим доступа: https://days.pravosla–vie.ru/Life/life6456.htm. – Дата доступа: 22.03.2022.